## Заданні гульні

### Заданне “Пачытай, размалюй і адгадай”

Калі Светлячок прыляцеў у краіну Белага Бусла (яе вы бачыце на малюнку) з Марса (а Марс – гэта планета бога вайны), ён хацеў зразумець, як тут жывуць людзі.






Яму растлумачылі: самае галоўнае ў краіне Белага Бусла – гэта мір. “Што такое мір?” – падумаў Светлячок і паглядзеў у інтэрнэце значэнне гэтага важнага для людзей краіны Белага Бусла слова. Але адказаў было чамусьці вельмі многа. Дапамажыце Светлячку выбраць слова, якое найлепш суадносіцца са словам “мір”:



ДУБ ДАР ЗЯМЛЯ ВЕК КОЛА РОД ЛАД ДОМ МІР СВЕТ ЧАС ШАР





Якое са значэнняў адпавядае выбранаму слову?

1. Дзяржаўная ці грамадская сістэма, арганізацыя.
2. Добрыя ўзаемаадносіны, згода, мір, сяброўства.
3. Спосаб пабудовы гукараду, арганізацыя музычных гукаў, строй музычнага твора.
4. Настрой, гумар, тон.

*Адказы:* лад – добрыя ўзаемаадносіны, згода, мір, сяброўства.

### Заданне “Збяры, размалюй і адгадай”

Бусел прапануе Светлячку адгадаць словы, у якіх “схаваліся” лексемы РОД, ЧАС, ДОМ, РОД, ЗЯМЛЯ і іншыя паняцці, якія для кожнага чалавека таксама з’яўляюцца каштоўнаснымі. Давайце дапаможам Светлячку, пры неабходнасці будзем карыстацца тлумачальным слоўнікам.

*Кожная каманда атрымоўвае набор картак з малюнкамі і лексічным значэннем слоў. Камандам неабходна суаднесці лексічнае значэнне з малюнкам, размаляваць і пад ім напісаць адгаданае слова, напрыклад:*

| | |
|---|---|
|  *Хлебарод* | *Добры ўраджай хлеба* |

**Набор картак для 1-й каманды**

| | | |
|---|---|---|
| **РОД**  |  |  |
|  |  |  |

| | | |
|---|---|---|
| Добры ўраджай хлеба | Насельніцтва якой-небудзь краіны, дзяржавы | Хімічны элемент, празрысты бясколерны газ |
| Сваякі, людзі, блізкія па паходжанні | Адносіны паміж людзьмі, якія маюць агульных продкаў | Усё існае на зямлі, не створанае дзейнасцю чалавека |

*Адказы:* 1. Кісларод – хімічны элемент, празрысты бясколерны газ. 2. Родзічы – сваякі, людзі, блізкія па паходжанні. 3. Роднасць – адносіны паміж людзьмі, якія маюць агульных продкаў. 4. Прырода – усё існае на зямлі, не створанае дзейнасцю чалавека. 5. Хлебарод – добры ўраджай хлеба. 6. Народ – насельніцтва якой-небудзь краіны, дзяржавы.

| | | |
|---|---|---|
| **МІР**  |  |  |
|  |  | |

| | | |
|---|---|---|
| Аптычная з’ява ў атмасферы, пры якой на гарызонце ўзнікаюць уяўныя адлюстраванні далёкіх наземных прадметаў | Духмяная смала, якая знаходзіцца ў кары некаторых трапічных дрэў | Расліна з белымі пухнатымі кветкамі, якія змяшчаюць эфірнае масла |
| Пладовае дрэва, падобнае на сліву | Вельмі вялікая, незлічоная колькасць | |

*Адказы:* 1. Мірт – расліна з белымі пухнатымі кветкамі, якія змяшчаюць эфірнае масла. 2. Мірабель – пладовае дрэва, падобнае на сліву. 3. Міраж – аптычная з’ява ў атмасферы, пры якой на гарызонце ўзнікаюць уяўныя адлюстраванні далёкіх наземных прадметаў. 4. Мірыяды – вельмі вялікая, незлічоная колькасць. 5. Мірра – духмяная смала, якая знаходзіцца ў кары некаторых трапічных дрэў.

| | |
|---|---|
| **ДОМ**  |  |
|  |  |

| | |
|---|---|
| Вялікая печка для плаўкі чыгуна | Той, каму належыць дом, уладальнік дома |
| Здагадка, заснаваная на меркаваннях, дапушчэннях | Струнны шчыпковы музычны інструмент |

*Адказы:* 1. Домра – струнны шчыпковы музычны інструмент. 2. Домаўладальнік – той, каму належыць дом, уладальнік дома. 3. Домна –

вялікая печка для плаўкі чыгуна. 4. Домысел – здагадка, заснаваная на меркаваннях, дапушчэннях.

| | |
|---|---|
| **ЗЯМЛЯ**  |  |
|  | |

| | |
|---|---|
| Ураджэнец адной з кім-небудзь мясцовасці | Часовае жыллё, зробленае ў зямлі |
| Жыхары планеты Зямля | |

*Адказы:* 1. Зямляне – жыхары планеты Зямля. 2. Зямляк – ураджэнец адной з кім-небудзь мясцовасці. 3. Зямлянка – часовае жыллё, зробленае ў зямлі.

| | |
|---|---|
| **КОЛА**  | Навучальная ўстанова, якая ажыццяўляе агульную адукацыю і выхаваяне маладога пакалення |

| | |
|---|---|
|  | Суквецце злакаў |

*Адказы:* 1. Колас – суквецце злакаў. 2. Школа – навучальная ўстанова, якая ажыццяўляе агульную адукацыю і выхаванне маладога пакалення.

| | |
|---|---|
| **ВЕК**  | Верхняя частка, якая служыць пакрыццём пасудзіны |
|  | Грамадская істота, якая мае высокаарганізаваны мозг, валодае мысленнем, маўленнем |

*Адказы:* 1. Чалавек – грамадская істота, якая мае высокаарганізаваны мозг, валодае мысленнем. 2. Века – верхняя частка, якая служыць пакрыццём пасудзіны.

**Набор картак для 2-й каманды**

| | | |
|---|---|---|
| **ШАР**  |  |  |
|  |  |  |

| | | |
|---|---|---|
| Густая салодкая маса,<br>прыгатаваная з фруктаў,<br>кавы або шакаладу<br>з цукрам, часта<br>з арэхамі | Загадка, у якой<br>загаданае слова<br>падзяляецца на часткі,<br>кожная з якіх –<br>самастойнае слова, якое<br>трэба адгадаць, каб<br>выйшла галоўнае слова | Шэры заяц |
| Пірог з яблыкамі | Abледзянелая скарынка<br>на паверхні снегу | Тоўстая і доўгая<br>іголка |

*Адказы:* 1. Шарбет – густая салодкая маса, прыгатаваная з фруктаў, кавы або шакаладу з цукрам, часта з арэхамі. 2. Шарпак – абледзянелая скарынка на паверхні снегу. 3. Шарада – загадка, у якой загаданае слова падзяляецца на часткі, кожная з якіх — самастойнае слова, якое трэба адгадаць, каб выйшла галоўнае слова. 4. Шаршатка – тоўстая і доўгая іголка. 5. Шарлотка – пірог з яблыкамі. 6. Шарак – шэры заяц.

| | | |
|---|---|---|
| **СВЕТ**<br> |  |  |
|  |  | |

| | | |
|---|---|---|
| Увесь свет | Прыстасаванне,<br>у якое ўтыкалася<br>лучына<br>для асвятлення хаты | Расліна сямейства<br>гваздзіковых |
| Невялікае насякомае,<br>жучок, які свеціцца<br>ў цемры | Сістэма поглядаў<br>на жыццё, прыроду<br>і грамадства | |

*Адказы:* 1. Светапогляд – сістэма поглядаў на жыццё, прыроду і грамадства. 2. Светлячок – невялікае насякомае, жучок, які свеціцца ў цемры. 3. Светнік – расліна сямейства гваздзіковых. 4. Сусвет – увесь свет. 5. Светач – прыстасаванне, у якое ўтыкалася лучына для асвятлення хаты.

| | |
|---|---|
| **ДАР**<br> |  |
|  |  |

| | |
|---|---|
| Чалавек, які раздае хлеб (у манастыры) | Даведачнае выданне, якое змяшчае паслядоўны пералік дзён, тыдняў і месяцаў года |
| Музыкант, які іграе на дудзе | Майстар па вырабе драўлянага посуду |

*Адказы: 1.* Дудар – музыкант, які іграе на дудзе. 2. Бондар – майстар па вырабу драўлянага посуду. 3. Каляндар – даведачнае выданне, якое змяшчае паслядоўны пералік дзён, тыдняў і месяцаў года. 4. Хлебадар – чалавек, які раздае хлеб (у манастыры).

| | |
|---|---|
| **ЛАД**  |  |
|  | |

| | |
|---|---|
| Араматычная смала, якая выкарыстоўваецца ў час богаслужэння | Шахматная фігура |
| Дзіцячая гульня, пры якой удзельнікі ўдараюць адзін аднаго спачатку правай далонню аб правую, потым левай аб левую і г. д. | |

*Адказы:* 1. Ладкі – дзіцячая гульня, пры якой удзельнікі ўдараюць адзін аднаго спачатку правай далонню аб правую, потым левай аб левую і г. д. 2. Ладан – араматычная смала, якая выкарыстоўваецца ў час богаслужэння. 3. Ладдзя – шахматная фігура.

| | |
|---|---|
| **ДУБ**  | Невялікі лісцевы лес, гай |
|  | Сорт груш |

*Адказы:* 1. Дубоўка – сорт груш. 2. Дуброва – невялікі лісцевы лес, гай.

| | |
|---|---|
| **ЧАС**  | Перыядычнае выданне ў выглядзе кніжкі |



Расліна з ядомай цыбулінай, якая мае востры смак і рэзкі пах

*Адказы:* 1. Часнок – расліна з ядомай цыбулінай, якая мае востры смак і рэзкі пах. 2. Часопіс – перыядычнае выданне ў выглядзе кніжкі.

Пасля выканання задання вучні павінны растлумачыць Светлячку, чаму паняцці РОД, ДОМ, ДАР, ЛАД, ЗЯМЛЯ і інш. маюць для чалавека такое важнае значэнне.

**Заданне “Устаў і растлумач”**

Дапаможам Светлячку ўставіць неабходныя словы ў прыказкі і растлумачым іх значэнне, каб жыхар з Марса – Светлячок – зразумеў, па якіх законах жывуць людзі ў краіне Белага Бусла – Беларусі.

**Словы і прыказкі для першай каманды**

| | |
|---|---|
| **МІР**<br>**РОД** **ЗЯМЛЯ**<br>**ВЕК**<br>**ДОМ** **КОЛА** | 1. Лепей лычны …, чым раменная сварка.<br>2. … – талерка, што пакладзеш, тое і возьмеш.<br>3. … пражыць – не поле перайсці.<br>4. Кожны на сваё … ваду цягне.<br>5. Які …, такі і плод.<br>6. Добра на Доне, але лепей у сваім … . |

*Адказы:* 1. Лепей лычны мір, чым раменная сварка. 2. Зямля – талерка, што пакладзеш, тое і возьмеш. 3. Век пражыць – не поле перайсці. 4. Кожны на сваё кола ваду цягне. 5. Які род, такі і плод. 6. Добра на Доне, але лепей у сваім … .

**Словы і прыказкі для другой каманды**

| | |
|---|---|
| **ЧАС**<br>**ДУБ** **ШАР**<br>**ЛАД**<br>**ДАР** **СВЕТ** | 1. Адзін … у полі – то не лес.<br>2. … не конь – не падгоніш і не прыгоніш.<br>3. Адклад не ідзе на … .<br>4. Смех – то … багоў.<br>5. На праўдзе … стаіць.<br>6. Зямны … на дабрыні трымаецца. |

*Адказы:* 1. Адзін дуб у полі – то не лес. 2. Час не конь – не падгоніш і не прыгоніш. 3. Адклад не ідзе на лад. 4. Смех – то дар багоў. 5. На праўдзе свет стаіць. 6. Зямны шар на дабрыні трымаецца.

**Рэфлексія.** Бусел прапануе з наступных выказванняў выбраць тыя, якія дапамогуць Светлячку назаўсёды зразумець, што такое “мір”.

1. Птушцы – воля, чалавеку – мір (беларуская прыказка).
2. Зямля дарагая, / Гэта нашы / Лугі і палі, / Над якімі / Спрадвеку лунае / Бусел – / Сімвал / Бяссмерця / Зямлі (Анатоль Грачанікаў).
3. Мы, беларусы – мірныя людзі, / Сэрцам адданыя роднай зямлі (Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь).
4. Чужое зямлі нам не трэба, / Пачуцці ў нас сёння адны: / Мы хочам, каб мірнае неба / Не знала пажару вайны (Алесь Бачыла).
5. Галоўныя словы? / Якія? / Гадаю. / А думкі – што вір. / А словы галоўныя – / МАМА І МІР (Мар’ян Дукса).

У канцы мерапрыемства камандамі падлічваюцца жэтоны і вызначаецца пераможца.